Хвала на вышынях Богу!

Wpisany przez Біскуп Гродзенскі
14.12.2012 01:00



Дарагія Чытачы газеты “Слова Жыцця”

Сын Божы нарадзіўся – узрадавалася ўсё стварэнне, неба і зямля. Анёлы заспявалі: “Хвала на вышынях Богу, а на зямлі супа-кой людзям добрай волі”. Успамінаючы гэтую ўрачыс-тую хвіліну, калі святло Бэтлеемскай зоркі асвяціла цемру ночы і неба ў прадказаным Богам горадзе Бэтлееме злучылася з зямлёю, дазвольце павіншаваць Вас, узлюбленыя Вернікі, з радасным святам Божага Нараджэння!



Дарагі Браце і дарагая Сястра! Кожны чалавек: дарослы і маленькі, здаровы і хворы, той, хто шукае праўду і спаўненне жыцця, і той, хто гэта ўжо знайшоў, – узвесяліся ў сваім сэрцы і падзякуй Найвышэйшаму Богу за таямніцу Яго любові, пранікніся гэтай гістарычнай падзеяй, якая перамяніла зямное існаванне. Бог нарадзіўся чалавекам. І няважна, што кажуць тыя, хто ў Яго не верыць ці сумняваецца ў Ягонай моцы. Вы майце моцную веру! Сёння, у гэтае радаснае свята Божага Нараджэння, калі разам з усім каталіцкім Касцёлам мы перажываем Год веры, я хачу заклікаць Вас, дарагія Вернікі, да падзякі Богу за ласку веры. Дарагія Браты і Сёстры, шануйце сваю веру, сцеражыце яе, штодня давайце сведчанне аб ёй, каб і іншыя маглі атрымаць ласку веры. Штодня маліцеся аб памнажэнні веры ў Вашых сем’ях, у душах дзяцей і моладзі, праяўляйце духоўную падтрымку тым, каму сёння не хапае веры або хто яе страціў. Пан Езус у чарговы раз збірае нас на ўспамін свайго Нараджэння, даверцеся Яму і моцна верце ў Ягоную моц! Малюся за кожнага з Вас перад нованароджаным Збаўцам і прашу, каб Бог усім Вам паблаславіў. У імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн. +Антоній Дзямідовіч